# Філворд

Філворды, таксама вядомыя як венгерскія крыжаванкі, уяўляюць сабой галаваломкі, у якіх патрабуецца знайсці ўсе словы, упісаныя ў квадратную сетку. На першы погляд літары ўпісаны хаатычна, але на самай справе ўсе яны з'яўляюцца часткай слоў. Словы могуць выгінацца ў любы бок пад прамым вуглом, але не перасякаюцца адно з адным.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Б | Л | Г | А | Ц | І | А | Б |
| У | А | Д | Ы | Ш | Н | К | Л |
| Я | І | В | М | Я | Д | Н | А |
| Ц | С | Ы | М | А | Л | А | Ж |
| Ь | К | У | Ь | К | А | М | Ы |
| Ь | Ь | Ц | Ц | С | А | Ь | Ц |
| Ц | Н | Е | І | Н | Ч | Ш | Ы |
| І | Б | А | Б | А | З | Я | Р |

**ПЫТАННІ:**

1. Прымаць роды (6);
2. Бачыць сон (5);
3. Месца, дзе калісьці было возера (8);
4. Бульбяное пюрэ ці каша (4);
5. Адчуваць млоснасць, дурноту (7);
6. Пранізлівы вецер з характэрным гукам (9);
7. Гліняны збан без ручкі (6);
8. Паляўнічая стрэльба, якая зараджаецца гатовымі набоямі ў гільзах (7);
9. Пышна цвісці (5);
10. Медны таз (7).

**Склаў Іван МАЗУРУК.**

**АДКАЗЫ:** 1. Бабіць; 2. Сніць; 3. Азярышча; 4. Камы; 5. Блажыць; 6. Віскуцень; 7. Гладыш; 8. Ламанка; 9. Буяць; 10. Мядніца.

## Продаж білетаў праз сеціва вырас да 30 %

### 3 запускам новых сэрвісаў БЧ

**Летась кожны чацвёрты білет на цягнікі з нумараванымі месцамі быў аформлены праз інтэрнэт. У цэлым па выніках мінулага года было прададзена 3,2 млн электронных білетаў, што склала 25 % ад усіх квіткоў на цягнікі Беларускай чыгункі з нумараванымі месцамі, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Пры гэтым у снежні мінулага года доля продажу электронных праязных дакументаў вырасла да 30 %. Гэта звязана ў тым ліку з пачаткам шырокага выкарыстання афіцыйнай мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік», якое стала даступным для запампоўкі на платформах Android і iOS. Таксама на карпаратыўным сайце www.rw.by запрацаваў абноўлены раздзел «Паслугі пасажырам», у якім з'явілася магчымасць афармляць праязныя дакументы непасрэдна пры праглядзе раскладу без пераключэння на іншыя рэсурсы. Па выніках студзеня 2020 года было аформлена больш за 270 тысяч электронных праязных дакументаў на цягнікі з нумараванымі месцамі, доля продажу таксама склала 30 %.

Дадатковым стымулам для выкарыстання новых рэсурсаў стала адмена з 1 снежня мінулага года камісійнага збору пры афармленні электронных білетаў. Гэта значыць, электронны квіток з электроннай рэгістрацыяй цяпер абыходзіцца пасажырам танней, чым пры куплі ў білетнай касе.

Варта адзначыць, што з дапамогай мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік» і новага раздзелу «Паслугі пасажырам» на афіцыйным сайце rw.by упершыню стала магчымым набываць электронныя квіткі і на цягнікі з ненумараванымі месцамі. У снежні-студзені было прададзена больш за 40,7 тысячы электронных білетаў на цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа і гарадскіх ліній.

Зручнай опцыяй для пасажыраў, якія штодня карыстаюцца гэтымі цягнікамі для паездак, да прыкладу, на працу, стала магчымасць аплаціць праз дадатак паездкі адразу на ўвесь працоўны тыдзень, а затым па меры неабходнасці актывізаваць іх.

Далейшая работа Беларускай чыгункі па ўдасканаленні электронных каналаў продажу праязных дакументаў будзе скіравана на зняцце абмежаванняў пры электроннай рэгістрацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 21 ЛЮТАГА

У краіне



**1835** год — нарадзіўся Міхаіл Восіпавіч Мікешын, расійскі і беларускі скульптар, графік і жывапісец. Па яго праектах створаны помнікі «Тысячагоддзе Расіі» ў Ноўгарадзе, Кацярыне II у Пецярбургу, Багдану Хмяльніцкаму ў Кіеве. Стварыў шэраг замалёвак з жыцця беларусаў. Ілюстраваў творы Гогаля, Шаўчэнкі, Пушкіна.

**1905** год — нарадзіўся Філафей (у свеце Уладзімір Еўдакімавіч Нарко), беларускі праваслаўны царкоўны дзеяч, магістр багаслоўя (1937).

**1915** год — нарадзіўся Цімафей Ерафеевіч Саладкоў, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1965), прафесар (1966).

**1950** год — нарадзілася Алена Сяргееўна Гурская, беларускі літаратуразнавец і крытык, кандыдат філалагічных навук (1982), дацэнт (1992). Даследуе праблемы мастацкіх пошукаў у сучаснай беларускай паэзіі, пытанні паэтыкі.

**1990** год — заснаваны Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

**1995** год — паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй падпісаны пагадненні: аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі і навукі; у галіне турызму; аб адзінстве кіравання мытнымі службамі; дагавор аб сумесных намаганнях у галіне аховы мытнай граніцы.

У свеце

**1895** год — нарадзіўся Карл Дам Хенрык, дацкі вучоны, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне (1943). Аўтар прац па біяхіміі стэрынаў і вітамінаў. Адкрыў вітаміны K1 і K2.



**1905** год — нарадзіўся Леў Канстанцінавіч Атаманаў, савецкі кінарэжысёр-мультыплікатар, адзін з пачынальнікаў савецкай маляванай мультыплікацыі, народны артыст РСФСР (1978). Уладальнік прызоў многіх міжнародных кінафестываляў.

**1920** год — УЦВК і Прэзідыум Вышэйшага савета народнай гаспадаркі прынялі рашэнне аб стварэнні Дзяржаўнай камісіі па электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО).

**1935** год — адкрыўся першы Маскоўскі міжнародны кінафестываль (старшынёй журы быў кінарэжысёр Сяргей Эйзенштэйн). З 1972 года афіцыйна ўключаны ў лік шасці найбуйнейшых сусветных кінафестываляў.

**1965** год — у Савецкім Саюзе здзейснены запуск штучных спадарожнікаў Зямлі «Космас-54», «Космас-55» і «Космас-56». Вывядзенне на арбіту ўсіх трох спадарожнікаў ажыццёўлена адной ракетай-носьбітам.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.17 | 18.29 | 10.12 |
| Віцебск — | 8.10 | 18.16 | 10.06 |
| Магілёў — | 8.08 | 18.19 | 10.11 |
| Гомель — | 8.01 | 18.19 | 10.18 |
| Гродна — | 8.32 | 18.45 | 10.13 |
| Брэст — | 8.30 | 18.49 | 10.19 |

### Месяц

*Апошняя квадра 16 лютага.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Андрэя, Захара, Сямёна, Фёдара.*
*К. Ірэны, Элеаноры, Яўгеніі, Фелікса, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Карэктар, у адрозненне ад карэкціроўшчыка, пастаянна выклікае агонь на сябе.

**— Як ты думаеш, чаму менавіта 8 Сакавіка — жаночы дзень?**

**— Таму што Ж — восьмая літара алфавіта.**

Сапраўдны джэнтльмен. Набрала ў абедзве рукі сумкі, дзіця ў кенгуру, іду праз парк. Насустрач такі акуратны пажылы мужчына. Паказвае ўніз: «Дзяўчына, у вас шнурок развязаўся». Я: «Я ведаю, іду якраз да той лавачкі, пастаўлю сумкі і завяжу». — «Пакуль вы дойдзеце, паваліцеся!» Прысядае і завязвае мне шнурок. Я ў шоку: «Дзякуй!» Ён злёгку пакланіўся і пайшоў. Падняў настрой на ўвесь дзень.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 384.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 лютага 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12